1. Аверинцев, С.С. Бахтин и русское отношение к смеху / От мифа к литературе : Сб . в честь 75-летия Е. М. Мелетинского. – М., 1993. – С. 341–345

2. Минский форум уличных театров [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://st-fest.org/ – Дата доступа : 13. 10. 2017

3. Фэст уличного искусства «На семи ветрах» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://fest7vetrov.by/ . – Дата доступа : 15. 10. 2017

**Крывашэй Ю.Ю.,** студэнт

Навуковы кіраўнік – Трамбіцкі К.С.

# УДЗЕЛ ВЫКАНАЎЦАЎ НА БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАХ У РЭСПУБЛІКАНСКІХ І МІЖНАРОДНЫХ КОНКУРСНЫХ І ФЕСТЫВАЛЬНЫХ ВЫСТУПЛЕННЯХ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праводзяцца мноства фестываляў: міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар» у Віцебску, міжнародны фестываль «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, абласны фестываль народнай творчасці «Напеў зямлі маёй» у Мар'інай Горцы і многія іншыя. Акрамя таго таксама праводзяцца фестывалі, дзе асноўная увага надаецца ваканаўцам на беларускіх народных духавых інструментах.

Фестываль (ад лацінскага «festivus» - вясёлы, святочны) – масавае свята,якое ўключаепаказ дасягненняў у галіне музыкі, тэатра, кіно, эстрады, цырка [3, с.398].

Галоўнымі задачамі фестываляў, якія больш напраўлены на спецыфіку выканальніцтва на народных духавых інструментах з'яўляюцца:

- Папулярызацыя музычнага мастацтва і выканальніцтва на беларускіх народных духавых інструментах;

- Папулярызацыя беларускай народнай інструментальнай музыкі;
- Павышэнне выканальніцкага майтэрства выканаўцаў;
- Актывізацыя творчай дзейнасці ўдзельнікаў;
- Выяўленне маладых таленавітых выканаўцаў;
- Эстэтычнае выхаванне навучэнцаў розных навучальных устаноў і г.д.

Адным з яскравых фестываляў з'яўляецца рэгіянальны фестываль выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментах «Грай музыка, грай!», прысвечаны памяці Заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Грома, стваральніка такіх вядомых калектываў як ―Крупіцкія музыкі” Крупіцкага цэнтра культуры, і капэлы беларускіх народных духавых інструментаў ―Гуды” Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Фестываль праходзіць у аграгарадку Крупіца Мінскага раёна. Арганізатары фестываля: Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага раённага выканаўчага камітэта, З.М. Гром, Крупіцкі цэнтр культуры.

Фестываль праходзіць раз у тры гады. Першы раз ён адбыўся ў 2015 годзе [1, с.3], а другі ў 2018. У гэтых фестывалях прымалі удзел такія калектывы і салісты як: ―Крупіцкія музыкі” (Крупіцкі ЦК), капэла беларускіх народных духавых інструментаў ―Гуды” ім. У. Грома (БДУКМ), ансамбль труб ―Festivo” Саюза музычных дзеячаў Беларусі, Народны ансамбль народнай музыкі ―Кросны” (МДКМ), Народны сямейны ансамбль ―Жывіца” (Борскі СДК Пухавіцкага раёна), Заслужаны артыст РБ Аляксандр Крамко, Дзяніс Сухі, Сяргей Ярук і многія іншыя.

Міжнародны фестываль-конкурс «Lobeska Baba Wielkanocna»у г. Лобез, Польша. Першы раз гэты фестываль прашоў у 2006 годзе. У адпаведнасці з традыцыяй «Lobeska Baba Wielkanocna»кожны год праходзіць у вербную Нядзелю. На фестываль прыязжаюць калектывы з розных краін: Беларусь, Польша, Расія, Германія і другія. Галоўнай падзеяй з‘яўляецца конкурс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выканаўцаў на народных інструментах. Падчас фестывалю таксама праводзіцца конкурс на «Выпечку і выраб Бабы».

Пераможцы фестываля узнагароджваюцца каштоўнымі прызамі і статуэткай.

Адкрыты абласны фестываль-конкурс ―Сымон-музыка" у г. Стоўбцы.

У гэтым годзе фестываль будзе праходзіць ужо 26 раз 26-27 красавіка 2018 года. Арганізатарамі з‘яўляюцца:

- Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама;
- Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Стаўбцоўскага райвыканкама;
- Дзяржаўная ўстанова адукацыі ―Стаўбцоўская дзіцячая школа мастацстваў".

У фестывалі прымаюць удзел навучэнцы дзіцячых музычных школ і школаў мастацтваў. Узрост да 17 гадоў.

Галоўная мэта фестываля – выяўленне і падтрымка маладых таленавітых дзяцей.

Рэспубліканскі конкурс выканаўцаў на духавых і ударных інструментах імя І. Дабравольскага праходзіць у горадзе Заслаў‘е. У адзін час з ім таксама праходзіць Рэспубліканскі адкрыты конкурс музычнага мастацтва Беларусі ―Спадчына". Арганізатары:

- Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь;
- Беларускі саюз музычных дзеячаў (ГА БСМД);
- Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»;
- Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Заслаўская дзіцячая школа мастацтваў»;
- Міжнародны дабрачынны Фонд імя Юрыя Розума.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія часы на гэтым фестывалі усё болей пачалі прымаць удзел выканаўцы на беларускіх духавых інструментах. Гэта азначае, што беларускія народныя духавыя інструменты сталі папулярней.

Міжнародны фестываль ―Валынкі свету”у г. Масква.

Гэты фестываль упершыню прайшоў у 2012 годзе. Кожны год ён праводзіцца восенню. Удзельнікі прыязжаюць з розных краін свету: Расія, Шатландыя, Іспанія, Італія, Францыя, Германія і многія другія. Пад час фестываля таксама ладзяцца майстар-класы, адкрытыя ўрокі. На гала-канцэрце выступаюць пераможцы фестываля і вядомыя выканаўцы з усяго свету.

Міжнародны фэст дударскіх рэгіёнаў ―Дударскі рэй” у г. Глыбокае.

Першы раз фестываль прайшоў у 2017 годзе. На фэсце былі прадстаўнікі з такіх краін як: Беларусь, Украіна, Велікабрытанія, Эстонія, Латвія, Літва, Польша і Чэхія. Свята праходзіць 2 дні. У праграму фэста уваходзіць: удзел у ўрачыстай Імшы ў касцёле Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў вёсцы Удзела, выступ дудароў на сцэнічнай пляцоўкі фестываля, гала-канцэрт удзелькаў [2].

На сёнішні дзень я лічу, што галоўнай задачай фестываляў выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментах Беларусі з‘яўляецца – развіццё, прапаганда, адраджэнне і захаванне выканальніцтва на гэтых інструментах, каб ў поўнай меры раскрыць сваю традыцыйную, нацыянальную архаічную годнасць і ўсведамленне сябе як беларуса.

1. Вяргейчык, М. Грай, музыка, грай! // Прысталічча. – 2015. – 6. – С. 3.

2. Лупач, З. У Глыбокім прайшоў Першы фэст дударскіх рэгіёнаў ―Дударскі рэй-2017” [Электронны рэсурс] // Westki.info. URL:http://westki.info/blogs/22186/u-glybokim-prayshou-pershy-fest-dudarskih-regiyonau-dudarski-rey-2017-dadalosya-videa. – 2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Фестываль // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т. 5 : Скамарохі – Яшчур / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал.рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1987. – С. 398.

**Крэнь В.М., Стararусава М.М.,** студэнткі
Навуковы кіраўнік – Байко А.П.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## САЦЫЯЛЬНА-АРЫЕНТАВАНАЕ ВАЛАНЦЁРСТВА СТУДЭНТАЎ ЯК УМОВА ФАРМАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАГА ВОПЫТУ

У кожным соцыуме ёсць людзі, для якіх праца на карысць іншых людзей з'яўляецца важным спосабам сувязі і зносін са светам і самім сабой, сродкам самарэалізацыі і самаўдасканалення. Аналіз публікацый у СМІ і эмпірычных фактаў сведчыць пра тое, што ў сучасным беларускім грамадстве назіраецца тэндэнцыя гуманізацыі адносін паміж людзьмі самых розных узроставых і сацыяльных груп. Пэўную ролю ў гэтым адыгрывае добра вядомы культурны феномен, спосаб рэальнай дапамогі і сацыяльнага служэння – валанцёрства. У шырокім сэнсе валанцёрства (voluntarius - у перакладзе з лацінскага азначае добраахвотна) – гэта дзейнасць, якая ажыццяўляецца добраахвотна на карысць людзям, без разліку на грашовае ўзнагароджанне. Папулярызацыя валанцёрства ў цэлым і маладзёжнага ў прыватнасці, выступае магутным грамадскім рэсурсам у паляпшэнні якасці жыцця ўсяго грамадства праз вырашэнне сацыяльных праблем. Міжнародная практыка валанцёрства паказвае, што добраахвотніцтва моладзі - гэта яшчэ і стратэгія пазітыўнага развіцця, якая забяспечвае асобасны рост і самаўдасканаленне моладзі [2].

Мэтай нашага даследавання стала параўнальнае асэнсаванне валанцёрскай дзейнасці як ўмовы фарміравання прафесійнага вопыту будучых спецыялістаў сацыякультурнай дзейнасці і артыстаў эстрады, якія атрымоўваюць адукацыю ў дзённай і завочнай формах навучання. Дадзеная